Ба 38324

Статут

БА
Зап 38324 БФ
Бел. аддзел
1994 г.

# СТАТУТ

## ТАВАРЫСТВА

## БЕЛАРУСКАЕ ШКОЛЫ.

ВІЛЬНЯ : : : : : : : : : : : 1926

25.04.2009

Беларуская Друкарня ім. Фр. Скарыны.
— Вільня, Людвісарская вуліца № 1. —

б зам 38324 Бр.

# СТАТУТ

## Таварыства Беларускае Школы.

### І. Назоў, мэта, месца быцьця і абшар дзейнасьці Таварыства.

§ 1. Таварыства завецца: „Таварыства Беларуткае Школы“ і мае на мэце пашыраць і памагаць асьвеце сярод беларусаў.

§ 2. Таварыства стаіць вонках усіх палітычных партый і кірункаў: адзінай яго задачаю ёсьць разьвіцьцё беларускіх школ і беларускае асьветы наагул.

§ 3. Дзеля правядзеньня ў жыцьцё мэты, азначанае ў § 1, Таварыства, згодна з абавязуючымі законнымі пастановамі, мае права:

1) закладаць, утрымліваць і падтрымліваць: а) народныя школы, б) курсы для дарослых няпісьменных, в) прытулкі, г) вучыцельскія сэмінарыі, школы ўзгадавацеляк, народныя чытальні і бібліатэкі, д) школы сярэднія і вышэйшыя ўсялякіх тыпаў;

2) закладаць народныя дамы дзеля асьветы і таварыскае гульні;

3) арганізаваць курсы і лекцыі зьместу культурна-асьветнага, за выьняткам тэм палітычных;

4) выдаваць і пашыраць беларускія школьныя кнігі (падручнікі), навуковыя, пэдагогічныя і народныя газэты;

5) даваць школьнай моладзі стыпэндыі, дапамогі і розную навуковую помач;

6) рабіць праекты будоўлі школ і школьных упарадкаваньняў і наглядаць за іх выкананьнем;

7) абвяшчаць конкурсы, патрэбныя дзеля дапяцьця мэтаў „Таварыства Беларускае Школы“.

§ 4. Месца быцьця Галоўнае Управы Т-ва ёсьць м. Вільня, абшарам дзеяльнасьці—Польская Рэспубліка.

§ 5. Т-ва зьяўляецца юрыдычнай асобаю, можа мець розную рухомую і нярухомую маемасьць, а гэтым самым можа купляць і прадаваць нярухомасьць.

## II. Маемасьць Таварыства.

§ 6. Маемасьць Т-ва складаецца:

1) з месячных складак сяброў,

2) з дабравольных ахвяр,

3) з дароў і запісаў,

4) з даходаў ад курсаў, лекцыяў і навуковых гутарак,

5) з працэнтаў ад жалёзнага капіталу,

6) з іншых непрадбачаных даходаў.

§ 7. Жалезны капітал складаецца:

1) са скарбаў, спэцыяльна на гэта ахвяраваных,

2) са скарбаў, вызначаных на гэта Агульным Сходам.

§ 8. Управа Т-ва вядзе руханковасьці паводле правілаў, права і звычаяў.

## III. Правы і абавязкі сяброў.

§ 9 Сябрамі Т-ва могуць быць поўналетвія, як фізычныя асобы бяз розьніцы полу, так і асобы юрыдычныя, прынятыя ў лік сяброоў урадам, на падставе рэкомэндацыі двух сяброў Таварыства.

§ 10. Сябры Т-ва дзеляцца на памагаючых, запраўдных і пачэсных.

Сябрам памагаючым можа быць кожная фізычная і юрыдычная асоба, што выплачвае на мэты Т-ва прынамся 2 злот. ў год.

Сябрам запраўдным можа быць кожная фізычная, маючая праўныя здольнасьці, або юрыдычная асоба, што выплачвае 1,5% свайго месячнага заработку, а калі нельга устанавіць пастаяннага зваработку, — 50 (пяцьдзесят) грошаў месячна.

Сяброў пачэсных назначае Агульны Сход па прэдстаўленьню Галоўнае Управы за асаблівыя заслугі на ніве беларускай асьветы.

§ 11. Запраўдныя сябры Т-ва маюць права: прыймаць учасьце ў дзейнасьцях гуртка, да якога належаць і галасаваць на зборках гэтага гуртка, прадстаўляць і падтрымліваць на зборках гэтага гуртка ўсялякія прапазыцыі, што скіраваны да правядзеньня ў жыцьцё мэтаў Т-ва.

Пачэсныя сябры маюць права прыймаць учасьце ў Агульным Сходзе, калі залічаны да якога гуртка, карыстаюць з правоў запраўдных сяброў без абавязку плаціць працэнтную адлічку.

§ 12. Сябра можа заўсёды выступіць з Т-ва, аднак-жа абавязаны наказаць аб гэтым пісьменна Управе Гуртка.

Сябра, які ня выплаціў месячнае сяброўскае складкі, або месячнае працэнтнае адлічкі, можа быць выкасаваны з ліку сяброў Т-ва па пастанове Управы Гуртка, да якога належыць, калі, ня гледзячы на пісьменнае паведамленьне, належных грошаў не аддае, або — калі яго месца быцьця няведама.

Выступленьне, або выкасаваньне з ліку сяброў не аслабаняе выступаючага або выкасаванага ад павіннасьці заплаціць складкі за той месяц, у якім хацеў выступіць, або быў выкасаваны, а таксама ён павінен аддаць усе ранейшыя даўгі.

§ 13. На прапазыцыю Управы Гуртка, Галоўная Управа можа пастанавіць выключыць сябра,

калі ён шкодзіць Т-ву, або зробіць пастудак проці грамадзянскага гонару.

## IV. Гурткі і Акружныя Управы.

§ 14. Гурток зьяўлаецца арганізацыяй пэўнага ліку асоб, дзеля правядзеньня ў жыцьцё аднаго або болей заданьняў, нацемляных у Статуце Т-ва.

Гурток можа заргнізавацца на падставе гэтага Статуту ў кожнай мясцовасьці, у якой захоча арганізаваць Гурток прынамся 10 чалавек, як сяброў запраўдных і калі Акружная Управа прызнае патрэбным арганізацыю Гуртка. На чале кожнага Гуртка стаіць Управа, якую абірае Агульны Сход сяброў гэтага гуртка.

§ 15. Гурткі злучаны ў Вокругі, якіх лічбу і прастор дзеяльнасьці, па прадстаўленьню Гуртоў, азначае Галоўная Управа Т-ва.

На чале кожнага Вокругу стаіць Акружная Управа, якую абірае Акружны сход, які складаецца з дэлегатаў усіх Гуртоў данага Вокругу.

§ 16. Агульныя Сходы ўсіх Гуртоў і Вокругаў, склікаюць Управы тых-жа гуртоў і Вокругаў, звычайныя — раз у год, надзвычайныя— ў меру патрэбы.

Арганізацыя Гуртоў і Вокругаў належыць да компэтэнцыі Галоўнае Управы, іх жа межы дзеяльнасьці азначаюць §§ 1, 2, 3 гэтага Статуту

## V. Галоўная Управа Таварыства.

§ 17. Галоўная Управа Т-ва складаецца з 12-ці сяброў, якіх абірае Агульны Сход на адзін год.

Апрача таго, Агульны Сход выбірае 4-х заступнікаў, якія пераймаюць абавязкі сяброў Управы, калі сябры гэтыя выступяць перад часам, на які выбіраны, або ня могуць цераз даўжэйшы час спаўняць свае абавязкі.

§ 18. Сябры Галоўнае Управы выбіраюдь паміж сябе на адзін год: Старшыню, двох яго заступнікаў, двох сэкрэтароў, скарбніка і яго заступніка.

§ 19. Да атрыбуцыі Галоўнае Управы належыць:

а) загадываньне маемасьцю і скарбамі Таварыства;

б) купляньне і прадаваньве нярухамасьці, працэнтных папераў і рознае рухомае маемасьці;

в) прыймо дароў і запісаў—умоўных і бязумоўных;

г) рабіць розныя ўмовы і даваць усялякага роду паўнамоцтвы, а паміж іншым і вясьці судовыя справы;

ц) састаўленьне гадавых справаздач і бюджэтаў;

е) кіраваць усялякімі справамі Таварыства на падставе гэтага Статуту ў межах компэтэнцыі, дадзенае Агульным Сходам;

ж) састаўленьне інструкцыяў і правіл для Гуртkoў і Вокругаў.

§ 20. Галоўная Управа можа тварыць асобныя аддзелы для паасобных спраў паводле інструкцый, зацьверджаных Нагляднаю Радаю.

§ 21. Засяданьні Галоўнае Управы бываюць у меру патрэбы, а прынамся двойчы ў месяц.

Для важнасьці пастаноў неабходна прысутнасьць Старшыні або яго заступніка і прынамся 6-ць сяброў Управы.

Пастановы прыймаюцца простай большасьцю галасоў; пры роўнасьці галасоў рашае голас Старшыні.

§ 22. Старшыня або яго заступнік рэпрэзэнтуюць Т-ва навонкі, а разам з адным сэкрэтаром падпісваюць ад імя Т-ва ўсе паперы і дакумэнты.

Чэкі і загады выплатаў падпісваюць Старшыня і Скарбнік Управы.

## VI. Наглядная Рада.

§ 23. Наглядная Рада складаецца з пяцёх сяброў, якіх абірае Агульны Сход на адзін год.

§ 24. Наглядная Рада:

а) рупіцца аб праўдзеньні ў жыцьцё заданьняў Т-ва Беларускае Школы, згодна з §§ 1. і 2. гэтага Статуту і кантралюе згоднасьць дзейнасьці Галоўнае Управы ды й усіх іншых органаў Т-ва з вымогамі Статуту, правіламі і інструкцыямі;

б) правярае касу Галоўнае Управы прынамся раз у год;

в) мае права пераглядаць кніжкі і пратаколы засяданьняў Галоўнае Управы і іншых органаў Т-ва;

г) мае права дамагацца, каб Галоўная Управа склікала Агульны Сход і паставіла на парадак дня справы і праекты, пададзеныя Радай;

д) мае права ўстрымаць кожную пастанову уладаў Т-ва, супярэчную з прынцыповымі правіламі гэтага Статуту або заданьнямі Т-ва, дамагаючыся скліканьня Агульнага Сходу, дзеля аканчальнага вырашэньня спорнае справы;

е) зацьвярджае правілы і інструкцыі, аб якіх гаворыцца ў § 20. гэтага Статуту;

ж) прадстаўляе Агульнаму Сходу гадавую справаздачу сваей дзейнасьці і свае праекты.

УВАГА: Сябры Наглsяднае Рады могуць з дарадчым голасам прыймаць удзел у засяданьнях Галоўнае Управы і ўсялякіх органаў Т-ва.

§ 25. Наглядная Рада можа вызначыць з паміж сябе дэлегатаў для выкананьня рэвізыяў, аб якіх гаворыцца ў § 24.

§ 26. Наглядная Рада выбірае з паміж сваіх сяброў на адзін год Старшыню, 2-х віцэ-Старшынь і 2-х сэкрэтароў.

§ 27. Паседжаньні Наглядная Рады адбываюцца ў меру патрэбы і прынамся чатыры разы ў год.

Для важнасьці пастаноў Наглядная Рады патрэбна прысутнасьць прынамся трох сяброў Рады, у тым ліку Старшыні або аднаго з віцэ-Старшынь.

Пастановы прыймаюцца простай большасьцю галасоў.

Пры роўным ліку галасоў рашае голас Старшыні.

## VII Агульны Сход.

§ 28. Агульныя Сходы бываюць звычайныя і надзвычайныя.

Звычайныя Сходы склікае Галоўная Управа ў апошніх двох месяцах кожнага году.

§ 29. Надзвычайныя Сходы склікае Галоўная Управа па сваёй ініцыятыве, або па дамаганьню Наглядная Рады, або нарэшце, па дамаганьню прынамся $^1/_4$ часьці агульнага ліку Акружных Упраў.

Галоўная Управа мае абавязак склікаць Агульны сход не пазьней, як у працягу трох тыдняў па атрыманьні пісьменнага дамаганьня.

§ 30. Аб дні і месяцы Агульнага Сходу Галоўная Управа абвешчае ў беларускіх газэтах прынамся за два тыдні перад днём Сходу.

§ 31. Агульныя Сходы складаюцца:

а) з сяброў Наглядная Рады,

б) з сяброў Галоўнае Управы і іх застпунікаў,

в) з прэзыдыюмаў аддзелаў ня болей як па тры асобы з кожнага аддзелу,

г) з Акружных Управаў—па два ад кожнае,
д) з дэлегатаў гурткоў — па два ад кожнага Вокругу,
е) з пачэсных сяброў.

Асобы, якія маюць права прыймаць учасьце ў Агульных Сходах, ня могуць пераказаць гэтага права другім.

§ 32. Агульны Сход ёсьць найвышэйшая ўстанова Т-ва, які выбірае сяброў Нагляднае Рады, Галоўнае Управы і аканчальна вырашае ўсялякія справы Т-ва, зьмяняе, дапаўняе Статут і ліквідуе Таварыства.

§ 33. Агульны Сход мае права выносіць пастановы, калі зьбярэцца прынамся $^1/_4$ людзей, маючых права ўчасьця ў гэтым сходзе.

Аднак для пастановаў аб зьмене Статуту, ліквідацыі Т-ва і для пастановаў аб маемасьці Т-ва пры яго ліквідацыі вымагаецца прысутнасьць палавіны сяброў, якія маюць права ўчасьця ў Агульным Сходзе.

У абвестках аб гэткім Сходзе павінна быць гэта выразна зазначана.

У прыпадку непрыбыцьця на Агульны Сход вымаганае для яго правамоцнасьці колькасьці сяброў, адбудзецца паўторны Сход — на два тыдні пазьней і пастановы гэтага Сходу будуць абавязковымі без увагі на лік прысутных.

У абвестках аб такім Сходзе гэта павінна быць выразна зазначана.

На гэтым паўторным Сходзе могуць разглядацца толькі такія справы, якія былі пастаўлены на парадку дня першага Сходу, які не адбыўся.

§ 34. Пастановы Агульнага Сходу прыймаюцца простай большасьцю пададзеных галасоў.

Аб справах-жа зьмены Статуту, ліквідацыі Т-ва і пастановаў аб маемасьці Т-ва пры яго ліквідацыі—большасьцю ²/₃ пададзеных галасоў.

## VIII. Ліквідацыя Таварыства.

§ 35. Калі-б Таварыства дзеля якіх-небудзь прычын было зьліквідавана, або само зьліквідавалася, ўся яго рухомая і нярухомая маемасьць пераходзіць на пашырэньне і падтрыманьне асьветы ў ў беларускім нацыянальным духу, згодна з пастановай Агульнага Сходу, або выбранае гэтым Сходам Ліквідацыйнае Камісіі,—аднак-жа, захоўваючы паасобныя ўмовы і запісы.

(—) Сымон Рак-Міхайлоўскі
Вільня, Вострабрамская вул. 7—10.

(—) Петкевіч Міхал
Вільня, Партовы завулак 12.

(—) Кс. А. Станкевіч
Вільня, касьцёл св. Мікалая.

Statut zalegalizowany na podstawie art. 12 Rozporzędzenia Komisarza Generalnego Ziem Wschodnich o stowarzyszeniach i związkach z dnia 25.IX. 1919 roku decyzją Ministra Spraw Wewnętrznych z dnia 27.IV. 1926 r. Nr. BB. 2580/26.

Za Ministra (podpis nieczytelny)
Naczelnik Wydziału.

(M. P.)

Na zasadzie postanowienia Wojewody w Wilnie z dnia 18. maja 1926. roku Nr. V. 2068. wciągnięto do rejestru stowarzyszeń i związków pod Nr. 410. stowarzyszenie pod nazwą „Towarzystwo Szkoły Białoruskiej".

Wilno, dnia 18.V. 1926. r.

Za wojewodę **Dworakowski.**

(M. P.)

Бел. аддзел
1994 г.

B00000004 10037